II Нядзеля Вялікага посту

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
28.02.2021 00:00



Мк 9, 2–10 Езус узяў Пятра, Якуба і Яна і павёў на высокую гару асобна іх адных. І перамяніўся перад імі. Адзенне Ягонае сталася бліскучым і вельмі белым, як ніводзін валюшнік на зямлі не можа выбеліць. І аб’явіўся ім Ілля з Майсеем і гутарылі з Езусам. І на гэта Пётр сказаў Езусу: “Раббі, добра нам тут быць, таму зробім тры шатры: адзін Табе, адзін Майсею і адзін Іллі”. Бо не ведаў, што сказаць, таму што яны спалохаліся. І з’явілася воблака, якое закрыла іх, і з воблака пачуўся голас: “Гэта Сын Мой умілаваны, Яго слухайце”. І адразу, калі яны агледзеліся навокал, ужо нікога не ўбачылі, апроч аднаго Езуса. Калі сыходзілі яны з гары, загадаў ім нікому не казаць, што яны бачылі, пакуль Сын Чалавечы не ўваскрэсне з мёртвых. І захавалі наказ, разважаючы між сабою, што значыць “уваскрэснуць”. †

Бог аб’яўляе сябе

На гары перамянення Езус паўстае перад вучнямі такім, якім з’яўляецца на самой справе. Ён – любімы Сын Айца. Жыццё і дзейнасць Майсея і Іллі мелі сэнс толькі ў адносінах да Яго самога. Усе прарокі, учарашнія і сённяшнія, усе заканадаўцы, настаўнікі, аўтарытэты гэтага свету павінны знайсці для сябе ўзор і апору ў Езусе Хрысце. Гэтым шляхам асабістага кіравання ўласага жыцця ў святле Хрыста павінны ісці Яго вучні. Бо Ён з’яўляецца адзіным, выключным стандартам для нашага чалавецтва.

Будучы з’яднаным з Езусам Хрыстом, кожны з нас становіцца любімым Божым дзіцём, і нішто ў свеце – прыгнёт, пераслед, няўдачы, пакуты – не можа знішчыць гэтую ісціну, якая пацвярджаецца ва Уваскрасенні Езуса.

Акунуўшыся ў Яго праз хрост, мы былі пераменены, пакліканы да бляску славы і, хаця ў цяперашняй рэчаіснасці павінны разам з Ім накіроўвацца ў Іерусалім, куды шлях пазначаны крыжом, мы, ужо ўсведамляючы сваю місію, ідзём з надзеяй да перамянення сэрца, ажно пакуль не дасягнём паўнаты чалавецтва ў Небе, калі і наша цела пераменіцца па прыкладзе Хрыста.

Пане Езу Хрысце, які, будучы нявінным, прыняў асуджэнні, акуні мяне ў Тваю міласэрнасць, каб, ідучы сваёй Крыжовай дарогай, я заўсёды быў верны Табе і непахісны. Дай мне патрэбную сілу і моц, каб магчы накіроўвацца ў Неба.